# Зямля і неба



Алена ІЛЬГЯВІЧУЦЕ

**Гродзенцы разам прачыталі любімыя творы класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа: на мінулым тыдні адбылося чарговае – ужо чацвёртае – мерапрыемства акцыі "Чытаем разам", якая ў год культуры праводзіцца ў публічных бібліятэках вобласці.**



*Фота с сайта http://grodnonews.by*

За мінулыя месяцы жыхары і госці горада сталі ўдзельнікамі вечарын, прысвечаных творчасці Кандрата Крапівы, Элізы Ажэшка, прозе і паэзіі пра Вялікую Айчынную вайну. А ў верасні настаў чарод Янкі Купалы і Якуба Коласа. Вядучыя сустрэчы справядліва адзначылі, што ў лёсах творцаў было шмат агульнага: яны нарадзіліся ў адным годзе, амаль адначасова выступілі ў літаратуры, добра ведалі адзін аднаго і сябравалі. І ўсё ж такі блізкія па сваіх эстэтычных поглядах і грамадскіх ідэях, Янка Купала і Якуб Колас розныя па творчай манеры. Нездарма ў літаратуразнаўстве ўстойлівым стаў выраз: "Купалава неба, Коласа – зямля".

Даніну павагі класікам, прачытаўшы і нават праспяваўшы іх творы, аддалі знакамітыя людзі Гродна, студэнты, школьнікі і ўсе, хто жадаў. Пачалося мерапрыемства з выканання лаўрэатам гарадскіх і рэспубліканскіх конкурсаў Іванам Вайтовічам "Спадчыны" Янкі Купалы. Своеасаблівасць гучанню кампазіцыі надала незвычайная аранжыроўка: аказваецца, класіка можа добра спалучацца з сучаснымі музычнымі тэндэнцыямі і нават узбагаціць іх, зрабіць больш змястоўнымі.

Старшыня ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама Аляксандр Сонгін, які быў адным з ганаровых гасцей мерапрыемства, абраў верш Янкі Купалы "Мая малітва". "З гадамі я стаў заўважаць, што прачытаўшы твор другі, трэці ці нават чацвёрты раз, разумееш яго зусім па-іншаму, – падзяліўся сваімі думкамі Аляксандр Генрыхавіч. – Калі мы гаворым "малітва", то думаем пра Бога. Але з узростам у гэтае слова пачынаеш укладваць і іншы сэнс».

Другі ганаровы госць – старшыня ўпраўлення па ўзаемадзеянні са сродкамі масавай інфармацыі, справах рэлігій і нацыянальнасцей галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама Вячаслаў Апановіч – прачытаў урывак са знакамітай паэмы Якуба Коласа "Новая зямля".

Акрамя твораў-візітовак у зале прагучалі і менш вядомыя творы, якія таксама заслугоўваюць увагі. Напрыклад, Янкі Купалы "Вялікдзень", "Я не для вас" і "Думкі салдата" Якуба Коласа. На жаль, ніхто не адважыўся дэкламаваць радкі па памяці, але прачыталі іх з душою. Спадзяюся, госці вечарыны, раней незнаёмыя з гэтымі вершамі, адчулі жаданне яшчэ раз вярнуцца да іх і адкрыць для сябе іншыя творы класікаў.

Напрыканцы мерапрыемства настаўніца беларускай мовы і літаратуры Вікторыя Янчарская выканала акапэла знакамітую "Малітву". "З гэтай песняй, канешне, шмат чаго звязана. Асабліва ўніверсітэцкае жыццё, – прызналася жанчына. – Больш таго, знаёмства з вучнямі таксама пачалося з "Малітвы": яе праспявала на першым занятку". Нягледзячы на тое, што Вікторыя Віктараўна назвала сябе аматарам, яе выкананне кранула многіх. А апошнім (праўда, ужо не музычным акордам вечара) было сумеснае чытанне вершаў Янкі Купалы "Не шукай" і Якуба Коласа "Родныя вобразы".